

*Да арт.* ***Антаблемент.*** *Інтэр'ер Гродзенскага касцёла бернардзінцаў.*

выкарыстоўваўся ў порціках (жылы дом у Гродне па вул. Замкавая), завяршэннях сцен будынкаў (*Пінскі палац Бутрымовіча*), у інтэр'еры (Радзівілімонтаўская сядзіба, Клецкі р-н). Як завяршальная частка сцен будынкаў выкарыстоўваўся ў архітэктуры 1930—50-х гг. (*Рэспубліканскі палац культуры прафсаюзаў* і інш.). А. быў таксама адным з важнейшых элементаў паярусната члянення алтароў і іканастасаў (алтар Гродзенскага касцёла бернардзінцаў).

**АНТАЛО́ГІЯ** (грэч. anthologia, літар. букет кветак), збор выбраных літаратурна-мастацкіх ці музычных твораў розных аўтараў. Вядома са страж. часоў на Усходзе і ў Грэцыі. Складальнікам першай А. лічаць грэч. паэта Мелеагра з Гадары. Вядомы А. Філіпа з Фесалонікаў, Дыягеніяна з Гераклеі, Стратона з Сард, кітайская «Шы-кінг», аўтарства якой прыпісваецца Канфуцыю. Беларуская А. бярэ пачатак ад страж.-рус. («Ізборнікі Святаслава» 1073, 1076). Адна з першых А. Новага часу — «Дыяменты беларускага прыгожага пісьменства» (1919). Сярод найб. значных А., якія выйшлі ў Беларусі: «Анталогія беларускай паэзіі» (т. 1—3, 1961; 2-е выд., т. 1—3, 1993), «Анталогія беларускага апавядання» (т. 1—2, 1967), «Анталогія беларускай народнай песні» (1968, 2-е выд. 1975), «Беларуская дакастрычніцкая драматургія», «Беларуская балада» (абедзве 1978), «Анталогія беларускай савецкай песні» (1979), «Анталогія беларускай эпітафіі» (2000), «Анталогія маладога верша», «Анталогія беларускай пародыі» (ч. 1—2), «Анталогія беларускай байкі», «Анталогія беларускай чароўнай казкі», «Анталогія беларускай народнай песні і прыпеўкі», «Анталогія беларускага народнага анекдота і жарту» (усе 2001), «Анталогія беларускага санета», «Насустрач Духу: анталогія хрысціянскай прозы», «Анталогія беларускай прыказкі, прымаўкі і выслоўя» (усе 2002), «Анталогія сучаснага беларускага мыслення» (2003), «Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI — першая палова XVIII ст.» (2005). *В.М.Іўчанка.*

**«АНТАЛО́ГІЯ БЕЛАРУ́СКАЙ НАРО́ДНАЙ ПЕ́СНІ»**, збор узораў народнапесеннай культуры беларусаў. Першае выданне выйшла ў 1968 у Мінску. Уключае 400 твораў, у т.л. запісы Р.Р.Шырмы, У.У.Алоўнікава, Л.С.Мухарынскай, К.І.Паплаўскага, З.Я.Мажэйка, А.А.Бальцэвіча і інш., якія размешчаны ў адпаведнасці з гіст. і жанрава-відавым прынцыпамі. Аснову збору складаюць каляндарна-абрадавыя і сямейна-абрадавыя песні. Таксама прадстаўлены пазаабрадавыя: любоўныя, сямейна-быт., рэкруцкія, салдацкія, бяседныя і інш. Гіст. прынцып класіфікацыі рэалізуецца праз сістэматызацыю твораў па перыядах: калектывізацыя, песні Зах. Беларусі, Вял. Айч. вайны і пасляваен. часу. Тэксты песень дадзены ў літ. апрацоўцы, што, верагодна, тлумачыцца жаданнем складальніка надаць ім сучасны эстэтычны ўзровень гучання і ўспрымання слухачамі. Нотная фіксацыя твораў дазваляе ўзнаўляць іх як прафесіяналам, так і аматарам. У прадмове да зборніка складальнік Г.І.Цітовіч звяртае ўвагу на асн. прынцыпы адбору песень, падкрэслівае агульнасць вытокаў нар. мастацтва 3 усх.-слав. народаў — рускіх, украінцаў і беларусаў, іх культ. ўзаемаадносіны, аналізуе прычыны захаванасці рэліктавых з'яў у песенным фальклоры беларусаў. Нар.-песенная культура Беларусі прадстаўлена ў зборніку такімі ўзорамі, як «Чарачка мая срэбная», «Павей, ветрык, павей», «Вяне рута», «Цераз сад-вінаград» і інш. У 1975 выйшла 2-е, дапоўненае, выданне, у якое ўвайшло 430 твораў з прадмовай і каментарыямі.

*А.М.Аляхновіч.*

**АНТАНАМА́ЗІЯ**, антанамасія (грэч. antonomasia ад antonomaeō называю інакш), 1) замена імя чалавека назвай прадмета ці з'явы, што з ім звязаны. Напр., «аўтар «Вянка» — М.Багдановіч, «народныя песняры» — Я.Купала і Я.Колас, «пясняр Нарачы» — М.Танк і інш. Выкарыстанне А. патрабуе дасведчанасці, добрага ведання фактаў жыцця і дзей-